Коршук, У. К. Беларуская сацыялістычная грамада: стварэнне і дзейнасць / У. К. Коршук //Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 20–29

***У. К. КОРШУК***

# БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРАМАДА: СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ

Беларуская сацыялістычная грамада была створана на аснове нацыянальна-культурных гурткоў беларускай моладзі (1902 г.): аб’ядноўвала інтэлігенцыю, шляхту, сялянства, уваходзілі ў яе арганізацыю і рабочыя. У снежні 1903 г. праходзіў Першы з’езд Грамады, які заявіў, што яна выступае як партыя сацыялістычнай арыентацыі. Было вырашана дабівацца для Беларусі краёвай аўтаноміі з сеймам у Вільні, гарантаваць культурна-нацыянальную аўтаномію для нацыянальных меншасцей.

У прадстаўленым на з’ездзе тэксце праграмы выкарыстоўваліся асобныя палажэнні з праграмных дакументаў ППС, эсэраў, Бунда. Была пастаўлена задача распрацаваць аграрную праграму. Пры гэтым, як і эсэры, БСГ не ўлічвала прынцыповых адрозненняў паміж пралетарыятам і сялянствам, іншымі пластамі працоўных, аб’ядноўваючы іх у адну сацыяльна-эканамічную катэгорыю — працоўны народ. Заяўляючы аб прызнанні класавай барацьбы, БСГ фактычна адмаўляла яе сярод беларусаў. Партыя называла сябе



арганізацыяй беларускага працоўнага народа. І ўсё ж у пачатку сваёй дзейнасці БСГ рабіла стаўку на беларускую вёску, аб’ядноўваючы вакол сябе сельскую інтэлігенцыю, сялян і сельскагаспадарчых рабочых. Заклікі БСГ вызваліцца ад рускага самадзяржаўнага і панскага эканамічнага прыгнёту атрымалі распаўсюджванне і падтрымку нават у самых глухіх месцах Беларусі. Пад кіраўніцтвам БСГ адбываецца шэраг сялянскіх забастовак, у час якіх сельгасрабочыя патрабавалі скарачэння да 14 гадзін рабочага дня, забароны работы па нядзельных і святочных днях і інш. У час руска-японскай вайны БСГ заклікала хавацца ад мабілізацыі, адмаўляцца ад удзелу ў несправядлівай вайне.

Ва ўмовах буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якая пачалася ў Расіі, БСГ заклікала народ на барацьбу: збіралася зброя, усталёўваліся кантакты з іншымі партыямі. Разам з эсэрамі БСГ асудзіла расстрэл мітынгу на прывакзальнай плошчы ў Мінску. Рыхтавала тэрарыстычныя акты супраць мінскага губернатара Курлова, вышэйшых чыноў жандармерыі, якія прымалі ўдзел у расстрэле.

У 1905 г. БСГ разам з эсэрамі стварае Беларускі сялянскі саюз, які павінен быў згуртаваць сялян у барацьбе за свае правы. Гэты саюз выдаваў лістоўкі, праводзіў іншую работу па растлумачэнні сялянам існуючага становішча. Саюз выступаў супраць абяцанай царом у Маніфесце ад 17 кастрычніка 1905 г. Дзяржаўнай думы, лічачы неабходным дабівацца выбараў ва ўстаноўчы сход, які адзін толькі можа даць абяцаныя свабоды, забяспечыць перадачу ўсіх земляў у рукі народа.

Грамада ўзаемадзейнічала з Польскай сацыялістычнай, Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыямі, Латышскім сацыял-дэмакратычным саюзам. Яны сумесна выдавалі нелегальную літаратуру, якая распаўсюджвалася, як правіла, у сельскай мясцовасці ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях і была адрасавана сялянам і сельскагаспадарчым рабочым.

Вялікую работу праводзілі грамадоўцы і на ніве адраджэння самасвядомасці беларусаў. Друкаваліся і распаўсюджваліся нелегальныя брашуры, творы Ф. Багушэвіча, якія мелі ярка выражаны сацыяльны характар і раскрывалі існуючую несправядлівасць у адносінах да беларусаў.

З кожным годам рос аўтарытэт БСГ сярод насельніцтва, павялічвалася колькасць яе членаў. У гады першай расійскай рэвалюцыі ў радах БСГ было каля 2 тыс. чалавек. Асабліва актывізавалася дзейнасць Грамады пасля стварэння ў канцы 1905 г. у Мінску ўласнай друкарні. Пры такіх абставінах у студзені 1906 г. у Мінску праходзіў II з’езд БСГ. Ён удакладніў праграму, разгледзеў аграрнае і арганізацыйнае пытанні, выбраў ЦК.



Гарачая дыскусія на з’ездзе разгарнулася пры абмеркаванні аграрнага пытання. Частка дэлегатаў патрабавала раздзелу зямлі. Іншыя раілі перадаць яе мясцовым органам улады. У выніку было прынята рашэнне аб неабходнасці стварэння нацыянальнага зямельнага фонду, кіраўніцтва якім павінен быў ажыццяўляць аўтаномны беларускі парламент (Сойм).

У прынятай з’ездам Праграме падкрэслівалася, што Беларуская сацыялістычная грамада, арганізоўваючы працоўны народ Беларускага краю без адрознення нацыянальнасцей, бачыць канчатковую мэту ў замене капіталістычнага ладу сацыялістычным.

Прызнаючы, што галоўным ворагам усіх вызваленчых імкненняў народа ў Расіі з'яўляецца царскае самадзяржаўе, БСГ лічыла сваёй бліжэйшай палітычнай задачай яго звяржэнне, выступаючы ў барацьбе за ажыццяўленне гэтай задачы сумесна з пралетарыятам усёй Расіі.

Імкнучыся замяніць самадзяржаўны лад Расійскай дзяржавы Федэратыўна-дэмакратычнай рэспублікай са свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй народнасцей, якія ўваходзілі ў склад дзяржавы, БСГ выстаўляла патрабаванне аўтаноміі Беларускага краю з мясцовым соймам у Вільні [1].

Пры гэтым падкрэслівалася, што вярхоўная ўлада павінна быць у руках заканадаўчага сходу пры самым шырокім мясцовым самакіраванні. Партыя заяўляла агульнадэмакратычныя патрабаванні: усеагульнае, прамое, роўнае выбарчае права; тайнае галасаванне пры выбарах; роўныя правы для ўсіх народнасцей, якія жывуць на адной тэрыторыі, культурна-нацыянальная аўтаномія; раўнапраўе ўсіх грамадзян без адрознення полу, рэлігіі, нацыянальнасці і расы; знішчэнне саслоўяў; выбарнасць чыноўнікаў і суддзяў; свабода сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў, стачак і забастовак; недатыкальнасць асобы і жылля; бясплатная абавязковая адукацыя для ўсіх за кошт дзяржавы; ліквідацыя ўсіх ускосных падаткаў і ўстанаўленне прагрэсіўнага падатку на даходы і спадчыны.

У галіне рабочага заканадаўства БСГ прапаноўвала ўстанавіць 8-гадзінны рабочы дзень, мінімум аплаты за працу і паляпшэнне яе ўмоў; аднолькавую аплату працы мужчынам і жанчынам. Партыя выступала за забарону начной працы і працы дзяцей да 14 гадоў; абмежаванне рабочага часу для падлеткаў (ад 14 да 18 гадоў шасцю гадзінамі ў дзень); устанаўленне штотыднёвага адпачынку; паляпшэнне ўмоў працы. БСГ лічыла неабходнай бясплатную медыцынскую дапамогу, дзяржаўнае страхаванне ад няшчасных выпадкаў, хваробы, старасці і беспрацоўя. Для кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, абароны сваіх правоў партыя раіла ствараць выбіраемыя рабочымі фабрычныя і сельскія інспекцыі.



Падкрэсліваючы сваё імкненне да перадачы ўсёй зямлі ў грамадскую ўласнасць, БСГ выстаўляла патрабаванне стварэння абласных зямельных фондаў з казённых, удзельных, кабінецкіх, царкоўных, касцельных, манастырскіх і прыватнаўласніцкіх земляў. Гэтая зямля падлягала перадачы малазямельным і беззямельным сялянам у пажыццёвае карыстанне.

Рашэнні II з'езда сведчаць аб адыходзе БСГ ад уплыву эсэраў. Так, з'езд адмовіўся ад эсэраўскай ідэі сацыялізацыі зямлі, падтрымаўшы ідэю стварэння абласных зямельных фондаў з ліку казённых, удзельных, царкоўных і памешчыцкіх уладанняў. Гэта больш адпавядала патрабаванням аўтаноміі Беларусі.

Пасля з'езда прымаюцца меры, накіраваныя на тое, каб аб'яднаць сялянскі рух за зямлю з агульнапалітычнай барацьбой у краіне. Працягваючы заклікаць да байкоту Дзяржаўнай думы, БСГ разам з тым лічыла магчымым накіроўваць у Думу розныя наказы, пасылаць туды хадакоў ад сялян.

Усё большую ролю ўдзяляе БСГ выдавецкай дзейнасці. Выходзяць беларускія нелегальныя лістоўкі, брашуры, зборнікі. Легальным органам Грамады робіцца штотыднёвая газета «Наша доля», першы нумар якой выйшаў у Вільні ў верасні 1906 г. Газета заклікала беларусаў да нацыянальнага адраджэння, патрабавала беларусізацыі сістэмы адукацыі, раіла ствараць сялянскія саюзы па тыпу прафесіянальных саюзаў гарадскіх рабочых, рэкамендавала дабівацца адзінства дзеянняў сялянскіх і рабочых саюзаў. Гэтыя заклікі не засталіся без увагі ўлад. На першы, трэці і чацвёрты нумары газеты быў накладзены арышт. А пасля выхаду шостага нумара газета была закрыта.

Сама БСГ ва ўмовах рэвалюцыі не змагла звязаць сваю дзейнасць з барацьбой шырокіх працоўных мас супраць самадзяржаўя. Асноўным аб'ектам уплыву Грамады было ўсё ж сялянства. Яе ўздзеянне на рабочых было нязначным. Да таго ж у гарадах яна сутыкнулася з канкурэнцыяй з боку сацыял-дэмакратычных арганізацый. Значную канкурэнцыю на вёсцы ёй складалі эсэры. Слабым быў уплыў Грамады ва ўсходніх раёнах Беларусі і на Віцебшчыне. Да таго ж рэальныя дзеянні БСГ часта не супадалі з праграмнымі патрабаваннямі. Адсутнасць паслядоўнасці і адзінства ў кіраўніцтве прывяло да таго, што партыя ўсё больш скочвалася на шлях рэфармізму. А ў 1907 г. яна фармальна была распушчана.

У такіх умовах кіраўніцтва БСГ засяродзіла сваю дзейнасць вакол пачаўшай выходзіць у лістападзе 1906 г. штотыднёвай легальнай газеты «Наша ніва», якая заявіла аб тым, што будзе служыць усяму беларускаму народу, руху, накіраванаму на яго нацыянальнае адраджэнне.

На старонках газеты былі публікацыі, накіраваныя супраць існуючага грамадскага і дзяржаўнага ладу. Аднак вастрыня палітычных выступленняў



усё больш спадае, уступаючы месца нацыянальна-культурным пытанням і праблемам эканомікі краю.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года БСГ узнавіла сваю дзейнасць. На працягу 1917 г. яе арганізацыі ўзніклі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску, а таксама ў Петраградзе, Маскве, Саратаве, Казані і іншых гарадах. БСГ актыўна ўключылася ў барацьбу за сацыяльную справядлівасць і нацыянальныя правы беларускага народа. Пры гэтым яна практычна цалкам падтрымлівала палітыку Часовага ўрада, стала на пазіцыі абарончаства, вітаючы насуперак сваёй папярэдняй праграме стварэнне беларускай народнай арміі,

якая б дапамагла беларускаму народу дамагчыся яго нацыянальных і сацыяльных мэт. У абставінах фарміравання іншых палітычных партый БСГ пакінулі прадстаўнікі буржуазна-ліберальных плыняў, якія сфарміравалі такія палітычныя арганізацыі, як Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя народных сацыялістаў і інш. З'яўляючыся партыяй нацыянальнай дэмакратыі, БСГ уступіла ў кааліцыю з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі і партыямі, створанымі на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі. Было выказана патрабаванне дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі.

У сакавіку 1917 г. на з'ездзе прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), які абвяшчаўся вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў Беларусі да выбараў у Цэнтральную Раду.

Беларускі нацыянальны камітэт ставіў сваёй мэтай культурна-нацыянальнае і палітычнае адраджэнне беларускага народа. Ён выступаў за стварэнне агульнай Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі, прычым у яе склад павінна была ўвайсці Беларусь як аўтаномная рэспубліка. У звароце да жыхароў Беларусі Беларускі нацыянальны камітэт пацвярджаў сваю расійскую арыентацыю, падкрэсліваючы, што эканамічнае становішча і тыя шырокія магчымасці, якія адкрыліся з рэвалюцыяй перад дэмакратычнай Расіяй, звязваюць Беларусь з Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікай. Камітэт лічыў неабходным перасцерагчы ад тых людзей, якія, прыкрываючыся імем беларускім, вялі б прапаганду за далучэнне да Польшчы або якой іншай дзяржавы. БНК павінен быў уступіць у перагаворы з Часовым урадам аб прызнанні аўтаноміі Беларусі, склікаць сялянскі і настаўніцкія з'езды. Аднак Часовы ўрад, які стаяў на пазіцыях адзінай і непадзельнай Расіі, адмовіўся прыняць прадстаўнікоў Беларусі.

Супраць беларускага нацыянальнага руху выступілі многія расійскія партыі, сярод якіх былі эсэры, кадэты, правыя чарнасоценныя элементы, сацыял-дэмакраты і інш. Частка з іх прыкрывалася пры гэтымбеларускімі



назвамі. Сярод іх «Саюз беларускай дэмакратыі» ў Гомелі, «Беларускі нацыянальны камітэт» у Магілёве, «Саюз беларускага народа» ў Віцебску і інш.

У такіх абставінах БСГ атрымлівае ўсё большую падтрымку. Мацнеюць яе арганізацыі ў Петраградзе, Маскве, Саратаве, ва Украіне, у Сібіры, у іншых гарадах, дзе жылі беларусы. Арганізацыі БСГ ствараюцца ў часцях Заходняга і Паўночнага франтоў. Расце колькасць БСГ і непасрэдна ў Беларусі. Да восені 1917 г. у сваіх радах яна налічвала каля 10 тыс. чалавек. Усё гэта сведчыць аб росце нацыянальнай самасвядомасці, імкненні да афіцыйнага прызнання факта існавання беларускага народа, яго раўнапраўя з іншымі народамі.

У кастрычніку 1917 г. у Мінску адбыўся III з'езд БСГ. Тут было зноў пацверджана, што Беларуская сацыялістычная грамада ставіць сваёй канчатковай мэтай ажыццяўленне сацыялістычнага ладу праз развіццё міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі. Аднак канкрэтныя палажэнні прынятай на з'ездзе Праграмы не выходзілі за межы дэмакратычных патрабаванняў, размова ў асноўным ішла аб рэфармаванні існаваўшага ладу.

У палітычнай галіне выстаўляліся патрабаванні, якія ў многім паўтарылі стары варыянт Праграмы. Але ў ёй з'явіліся і новыя палажэнні: патрабаванне непасрэднага ўдзелу самога народа ў заканадаўстве; права заканадаўчай ініцыятывы, увядзенне рэферэндуму для вырашэння найбольш важных пытанняў. Лічачы, што Расія павінна быць федэратыўнай рэспублікай, БСГ прапаноўвала ажыццявіць тэрытарыяльную і персанальную аўтаномію для ўсіх нацыянальнасцей. Выступаючы за дэцэнтралізацыю ўлады, партыя прапаноўвала прадставіць аўтаномію абласцям і абшчынам, якія вызначаюцца эканамічнымі і бытавымі ўмовамі. Пры гэтым павінна была ажыццяўляцца выбарнасць мясцовай адміністрацыі; адказнасць яе перад судом і змяняльнасць па патрабаванні народа. БСГ патрабавала аддзялення царквы ад дзяржавы, свецкага навучання ў школах, падкрэсліваючы, што рэлігія — асабістая справа кожнага чалавека. Упершыню ў праграму было ўнесена патрабаванне, якое закранала знешнепалітычныя праблемы: неабходнасць стварэння міжнароднага суда для вырашэння спрэчак паміж дзяржавамі.

У галіне эканамічнай прапаноўвалася забарона куплі і продажу зямлі, якая павінна была без выкупу перайсці ва ўсенародны набытак. Пры гэтым зямлёй павінны былі надзяляцца толькі грамадзяне, якія непасрэдна на ёй працавалі. Прапаноўваўся спецыяльны падатак на найбольш урадлівую зямлю ў такім памеры, каб ураўнаваць аплату працы на беднай і багатай зямлі. Усім зямельным уладкаваннем у Беларусі павінна была кіраваць



Беларуская Краёвая Рада, выбраная ўсім народам шляхам усеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага галасавання. Канфіскаваную зямлю прапаноўвалася перадаць у распараджэнне мясцовых органаў самакіравання.

Ставілася задача падтрымкі і распаўсюджвання кааператыўных арганізацый: спажывецкіх таварыстваў, крэдытных таварыстваў і інш. Патрабаванні ў галіне рабочага заканадаўства дапаўняліся наступнымі палажэннямі: забарона дзіцячай працы да 16 гадоў і ўвядзенне 6-гадзіннага рабочага дня для падлеткаў ад 16

да 18 гадоў; забарона жаночай працы ў галінах, дзе яна шкодная для жаночага арганізма; прадастаўленне аплачваемага 4-тыднёвага водпуску да родаў і 6-тыднёвага пасля родаў з аказаннем бясплатнай медыцынскай дапамогі.

Выступаючы за свабоду і беспакаранасць забастовак, БСГ патрабавала захавання заработнай платы за час забастоўкі. Для нагляду за фабрыкамі і заводамі прапаноўвалася стварыць выбарную інспекцыю; выбарны заводскі ці прамысловы суд; перадаць кіраванне біржамі працы ў рукі рабочых. Партыя лічыла неабходным устанаўленне крымінальнай адказнасці за парушэнне законаў па ахове працы. БСГ заяўляла аб сумесных дзеяннях у падтрымку прафесіянальных саюзаў і іншых арганізацый, якія выступаюць за абарону правоў рабочых.

Беларуская сацыялістычная грамада ставіла задачу дамагацца развіцця беларускай нацыянальнай культуры, заканадаўчага прызнання беларускай мовы, яе ўжывання ў школе, судзе, адміністрацыйных і грамадскіх установах Беларусі.

Разглядаючы пытанне аб дзяржаўным уладкаванні, партыя выступала за поўнае самакіраванне (аўтаномію) Беларусі з заканадаўчым органам Краёвай Радай, выбранай на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права для мясцовага заканадаўства; супраць таможных граніц паміж Беларуссю і іншымі часткамі Расійскай Федэрацыі, за поўнае палітычнае і эканамічнае раўнапраўе для ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі.

Такім чынам, новая Праграма партыі была значна пашырана, але разам з тым яна не выходзіла за рамкі буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года БСГ актыўна ўключылася ў барацьбу за сацыяльную справядлівасць і нацыянальныя правы беларускага народа. Пры гэтым яна практычна цалкам падтрымала палітыку Часовага ўрада, стала на пазіцыі абарончаства, вітаючы насуперак сваёй папярэдняй праграме стварэнне беларускай народнай арміі, якая б дапамагла беларускаму народу дамагчыся яго нацыянальных і сацыяльных мэт [2].

26

Ва ўмовах фарміравання іншых палітычных партый БСГ пакінулі прадстаўнікі буржуазна-ліберальных плыняў, якія сфарміравалі такія палітычныя арганізацыі, як Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя народных сацыялістаў і інш. З’яўляючыся партыяй нацыянальнай дэмакратыі, БСГ уступіла ў кааліцыю з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі і партыямі, створанымі на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі. Было выказана патрабаванне дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі [3].

Такім чынам, выступаючы за аўтаномію Беларусі ў складзе Расіі, БСГ не выстаўляла патрабавання поўнай незалежнасці Беларусі ад Расіі. У звароце да беларускай інтэлігенцыі адзін з вядомых дзеячаў Грамады С. Рак-Міхайлоўскі падкрэслівае: «...Аб ніякім аддзелу ад Расіі і гутаркі быць ня можа, ніхто гэтага і дабівацца ня будзе і ніколі народ гэтага не захоча, бо мы звязаны з усей Расіяй і ў гандлю, і ў промыслах, і ва ўсім гаспадарскім жыцці дзяржавы, і мы будзем разам з усёй Расіяй крапчэй, мацней, чым аддзяліўшыся... Мы толькі хочам, каб было тут, у нас краёвае самапарадкаванне з сваіх выбарных мясцовых людзей, свае выбарныя чыноўнікі і вучыцелі, суд і школа ў роднай мове ...»[4].

Летам-восенню 1917 г. пры актыўным удзеле БСГ прадпрымаюцца спробы стварыць у Беларусі ўласную ўладу. У жніўні 1917 г. БНК, які, як адзначалася, не карыстаўся папулярнасцю сярод працоўных, быў скасаваны, а замест яго створана Цэнтральная Беларуская Рада (ЦБР), якая ў канцы кастрычніка 1917 г. пераўтварылася ў Вялікую беларускую Раду (ВБР).

Рада разам з Цэнтральнай беларускай вайсковай Радай (ЦБВР) прызначыла на снежань 1917 г. скліканне Усебеларускага з’езда для вырашэння пытання «Аб краявой уладзе». Гэтую ідэю пазней падтрымаў і існуючы ў Петраградзе пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў Беларускі абласны камітэт (БАК).

На з’езд, які адбыўся ў снежні, прыбылі 1872 дэлегаты ад БСГ, эсэраў, меншавікоў, бальшавікоў. На ім прысутнічалі прадстаўнікі гарадскіх дум, земстваў, афіцэраў і салдат, сялян, рабочых, настаўнікаў, урачоў і г. д. Шматпартыйны склад наклаў адбітак на ход дыскусій.

Бальшавікі, недаацэньваючы нацыянальны рух на Беларусі, былі супраць стварэння Беларускай дзяржавы, лічачы, што ў парадку дня стаіць сусветная рэвалюцыя, стварэнне сусветнай савецкай рэспублікі, а не дзяржаўнасці для асобных рэгіёнаў Расіі.

ВБР не была супраць улады беларускіх Саветаў сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Яна выступала за стварэнне самастойнай Беларускай Народнай Рэспублікі. БАК быў за стварэнне самастойнай рэспублікі ў рамках Расійскай Федэрацыі.

27

З’езд абвясціў права Беларусі на самавызначэнне і сцвярджэнне рэспубліканскага ладу, пастанавіў утварыць часовы выканаўчы орган улады. Аднак ён быў аб’яўлены незаконным і распушчаны бальшавіцкай партыяй, якая стаяла ва ўладзе.

У гэтых умовах адбываецца раскол у беларускім нацыянальным руху. З аднаго боку, у радах БСГ набірае моц правае крыло, што выступала за сепаратызм, супраць устанаўлення Савецкай улады ў Беларусі. З другога, — левае крыло, якое стаяла на пазіцыях інтэрнацыяналізму, заклікала працоўныя масы да рэвалюцыйнай барацьбы і заяўляла аб прыярытэце рэвалюцыйных задач над нацыянальнымі. Раскол БСГ назіраецца на III з'ездзе. Левая плынь, якая аб'ядноўвала петраградскую, маскоўскую і бабруйскую арганізацыі, хаця арганізацыйна і не парвала з партыяй, але і не падпарадкоўвалася ЦК. Яе кіруючым цэнтрам стаў Петраградскі камітэт БСГ.

Тэндэнцыі незалежнасці ў беларускім вызваленчым руху асабліва ўзмацніліся пасля падпісання 3 сакавіка 1918 г. Брэсцкага мірнага дагавора, дзе лёс Беларусі быў вырашаны без удзелу яе прадстаўнікоў.

У гэтых умовах Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда 9 сакавіка абвясціў Беларусь Народнай Рэспублікай. Уся паўната ўлады перадавалася Радзе, якая па прапанове прадстаўнікоў БСГ была пераўтворана ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. Супраць незалежнасці Беларусі выступілі прадстаўнікі некаторых нацыянальных меншасцей. Сярод іх шэраг польскіх, рускіх і яўрэйскіх арганізацый на Беларусі. У апазіцыі да Рады аказаліся і члены «Мінскага беларускага прадстаўніцтва», якія выступалі за беларуска-германскае збліжэнне.

Пасля дэбатаў кіраўніцтва Рады заявіла, што будучыню Беларусі яно бачыць толькі пад апекай Германіі, і звярнулася з тэлеграмай да кайзера Вільгельма, у якой выказвалася глыбокая падзяка нямецкім войскам за вызваленне ад чужога прыгнёту, насілля і анархіі. Дэкларуючы незалежнасць і непадзельнасць Беларусі, Рада прасіла аб абароне яе дзейнасці для ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і непадзельнасці краю. Выступала за саюз з Германіяй.

Паколькі гэты зварот прымаўся ўпотай на закрытым пасяджэнні Рады, звесткі аб ім выклікалі рознагалоссі сярод розных груповак. Левая частка Грамады адклікае сваіх членаў з урада. Усё гэта яшчэ больш аслабіла БСГ, прадстаўнікі якой пераважалі ў Радзе.

Тым не менш барацьбу БСГ за стварэнне сваёй нацыянальнай дзяржавы не трэба недаацэньваць. Выкарыстоўваючы прагрэсіўнасць агульнанацыянальнай ідэі за самастойнае і незалежнае культурнае, эканамічнае і палітычнае развіццё, яны імкнуліся да стварэння сваёй Беларускай дзяржа-



вы. Не ўсе свае мэты БСГ ажыццявіла. Прадстаўнікі шэрага беларускіх партый лічылі яе адказнай за тое, што яна не ўсё зрабіла для аб'яднання палітычных сіл Беларусі, за тое, што правае крыло БСГ ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1918 г. зрабіла стаўку на супрацоўніцтва з немцамі, якія, нарэшце, заявілі, што не могуць дапусціць існавання побач са сваёй уладай улады беларускай.

У 1918 г. супярэчлівасці, трэнні ў яе радах прывялі да распаду БСГ. На яе аснове ўзніклі тры палітычныя партыі: дзве — сацыял-дэмакратычнага накірунку — Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя і партыя народніцкага напрамку — Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

---

[1] Гл.: Программа Белорусской Социалистической Громады // Праграмныя дакументы палітычных партый. Мн., 1994. С. 4.

[2] Тамсама. С. 5.

[3] Тамсама. С. 9.

[4] *Рак-Міхайлоўскі С.* Да беларускай інтэлігенцыі, вясковых вучыцеляў // Вольна Беларусь. 1917. 17 жн.

[5] ЦДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 15.

[6] Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом...) // Праграмныя дакументы палітычных партый. С. 7.